

ДЫЗАЙН МУЛЬТЫМЕДЫЯ І МІКРАБІЯЛОГІЯ

ЧЫРВОНКА

У ШКОЛЕ МОЖНА ЦАЛКАМ РЭАЛІЗАВАЦЬ СЯБЕ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 108 (29988)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Сёння Захад разумее, што прайграе санкцыйную вайну, якую вядзе супраць Беларусі. І каб апраўдаць свае незаконныя дзеянні, уцягнуць у гэтую брудную гульню іншыя краіны, спрабуе выкарыстоўваць пляцоўку Міжнароднай арганізацыі працы. Гэта абсурд поўны. Міжнародная арганізацыя працы, па сваёй сутнасці, павінна абараняць занятасць і даходы людзей. Для гэтага яна створана гістарычна. А сёння заходнікі спрабуюць працягнуць праз гэтую арганізацыю рашэнне, якое накіравана на тое, каб пакінуць людзей без работы і без зарплаты... Прафсаюзы больш як сотні краін, якія ўваходзяць у Сусветную федэрацыю прафсаюзаў, калектыўна выступілі катэгарычна супраць прымянення якіх-небудзь абмежаванняў, але такая пазіцыя мільёнаў працоўных не проста праігнараваная. Яна хаваецца і замоўчваецца. Робіцца ўсё для таго, каб паказаць, што нібыта працоўныя ўсяго свету падтрымліваюць МАП у дадзеным пытанні. Гэта абсалютна не так. Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што справа супраць Беларусі — маніпуляцыя думкай і фальсіфікацыя».*

# Бліжэй да Неба



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

**Малады спецыяліст па мантажы смальтавай мазаікі мінчанка Наталля ЛАЗАРЭВІЧ удзельнічае ва ўпрыгожванні званіцы Богаяўленскага храма, які ўзводзіцца на ўскрайку сталічнага мікраараёна Лошыца.**

Па палічках

## БАЛЬНІЧНЫЯ БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЬ ПА-НОВАМУ

### Як зменяцца іх памеры?

**З будучага года змяняецца парадак налічэння бальнічных. І тут ёсць некалькі істотных змяненняў. Найперш мінімальная выплата па бальнічным вырасце ў тры разы. Гэта актуальна для тых работнікаў, якія выплачвалі ўзносы ў ФСАН менш за шэсць месяцаў, бо ў іх асобны парадак падліку дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Для тых, у каго стаж работы складае дзесяць і больш гадоў, 100 % сярэднядзённага заробку будзе налічвацца з першага дня бальнічнага. Для астатніх — 80 %. А перыяд для падліку сярэднядзённага заробку вырасце з шасці да 18 месяцаў.**

### 2,2 МІЛЬЯРДА НА ВЫПЛАТУ

Як адзначыла **кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА**, з 1 студзеня 2024 года чакаецца шэраг навацый па пытаннях прызначэння і выплаты дапамог па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах. У 2022 годзе на выплату ўсіх відаў дапамог з бюджэту фонду было накіравана 4,4 мільярда рублёў, што складае каля 21 % у расходнай частцы бюджэту фонду.



СТАР. 2

Клімат

## НА ХВАЛІ СПЁКІ

### Нас папярэджваюць аб экстрэмальных тэмпературах ужо гэтым летам

**У найбліжэйшыя пяць гадоў глабальныя тэмпературы могуць павысіцца да рэкордных узроўняў, чаму будуць спрыяць парніковыя газы і натуральная гарачая з'ява Эль-Ніньё, адзначаецца ў новым бюлетэні Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА). Як гэта закране жыхароў нашага паўшар'я і нашай краіны?**

### ТРЫ МЕСЯЦЫ НА МАКСІМУМЕ

Спачатку мы разбяромся з тым, якое нас чакае надвор'е ў бягучым сезоне. Як правіла, да такіх прадказанняў на тры месяцы, на думку экспертаў, варта ставіцца вельмі асцярожна. Значыць...

Сёлетняе лета ў Беларусі будзе гарачэйшае, чым звычайна. Пра гэта сведчаць даныя аднаго замежнага інстытута метэаралогіі і воднай гаспадаркі. Наколькі павысіцца сярэдняя тэмпература і што кажуць прагнозы метэаролагаў пра ападкі?

СТАР. 4



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## КОРАТКА

- **Фізасобы ў Беларусі ў маі прадалі на $142,6 млн валюты больш, чым купілі.**
- Брэсцкі гарвыканкам выдзеліў дадаткова Br1,3 млн на рамонт сельскіх ФАПаў і гарбальніц.

ISSN 1990 — 763X

23108

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# БАЛЬНІЧНЫЯ БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЬ ПА-НОВАМУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У структуры расходаў на ўсе віды дапамог бальнічныя складаюць каля 40 %, або 1,8 мільярда рублёў. Менавіта столькі было накіравана з ФСАН на фінансаванне бальнічных у 2022 годзе. Сёлета з улікам росту заработных плат на выплату згаданых відаў дапамог запланавана каля 2,2 мільярда рублёў.

— З 1 студзеня 2024 года рашэннем Урада № 945 павысіцца ўзровень сацыяльных гарантый грамадзян па выплаце дапамог па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці ды родах, — падкрэсліла Юлія Берднікава.

### УТРАЯ ВЫРАСЦЕ МІНІМАЛЬНЫ ПАМЕР ДАПАМОГІ

Дадзеная навацыя актуальная для людзей, якія ўладкаваліся на работу нядаўна, скажам, пасля заканчэння навучальнай установы (акрамя маладых спецыялістаў), і калі перыяд выплаты ўзносаў у ФСАН складае ў іх менш за шэсць месяцаў.

Для іх з будучага года павысіцца мінімальны памер бальнічных і ён будзе вылічвацца з памеру мінімальнай заработнай платы, якая на сёння складае 554 рублі. Цяпер мінімальны памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці вылічваецца ў памеры 50 % бюджэту пражытковага мінімуму, а гэта 176 рублёў.

— Калі чалавек, які працуе менш за шэсць месяцаў, захварэў і яго хвароба доўжылася 30 дзён, то ён атрымае дапамогу па непрацаздольнасці ў памеры 554 рублі. Сёння гэтая сума складае 176 рублёў, — прыводзіць прыклад Юлія Берднікава. — Такім чынам мінімальны памер аплаты часовай непрацаздольнасці вырасце фактычна ў тры разы.

### ДЛЯ КАГО ПАВЯЛІЧАЦЦА?

Ён вырасце для работнікаў, якія працуюць дзесяць і больш гадоў.

— Для грамадзян, якія выплачваюць узносы ў ФСАН дзесяць і больш гадоў, памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці будзе вылічвацца з першага дня ў памеры 100 % сярэднядзённага заробку. У тых грамадзян, у якіх працягласць выплаты ўзносаў у бюджэт фонду меншая за дзесяць гадоў, бальнічныя будзе вылічваць у памеры 80 % сярэднядзённага заробку для ўсёй працягласці выпадку непрацаздольнасці, — тлумачыць кіраўнік фонду.

Нагадаем, што сёння формула разліку іншая. Яна не залежыць ад працягласці выплаты ўзносаў у ФСАН і адзіная для ўсіх катэгорый грамадзян. Цяпер кампенсуецца



Фота БелТА.

80 % сярэднядзённага заробку з 1 да 12 дня хваробы, а далей, з 13-га дня, — 100 %.

### У РАЗЛІК ВОЗЬМУЦЬ УСЁ

Павялічыцца памер сярэднядзённага заробку, які прымяняецца для разліку бальнічных. У новых умовах у яго будуць уключацца ўсе налічэнні і выплаты, на якія разлічваюцца ўзносы ў ФСАН. Нагадаем, што ў бюджэт фонду на сацыяльнае страхаванне выплачваецца 6 %, і ўсе выплаты, на якія яны налічаюцца, будуць удзельнічаць у формуле разліку сярэднядзённага заробку. Пакуль жа пры вылічэнні сярэднядзённага заробку не ўлічваюцца такія разавыя выплаты, не звязаныя з выкананнем працоўных абавязкаў, як матэрыяльная дапамога і дапамога на аздараўленне.

### НЕ АПЛАЦЯЦЬ, КАЛІ ПРАЦАВАЛІ ПА СУМЯШЧАЛЬНІЦТВЕ

Наступная навацыя — бальнічныя будуць выплачвацца толькі па асноўным месцы работы, але з улікам заробку ва ўсіх наймальнікаў, у тым ліку і былых.

— Калі чалавек хварэў, ён прадстаўляе лісток непрацаздольнасці па асноўным месцы работы і асноўны работадавец прызначае бальнічны. Пры гэтым фонд работадаўцу дасць два параметры: працягласць выплаты ўзносаў у бюджэт фонду і памер сярэднядзённага заробку, бо функцыю вылічэння дапамогі ў новых умовах са студзеня 2024-га на сябе бярэ Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, — тлумачыць Юлія Берднікава. — І разлік будзе весціся не толькі па асноўным месцы работы, але і па ўсіх іншых дзеючых месцах работы, а таксама папярэдніх, калі яны трапляюць у разліковы перыяд.

Акрамя таго, у новых умовах права на бальнічны будзе вызначацца па ўсіх месцах работы. Калі ў вас некалькі месцаў работы, неабходна, каб перыяд непрацаздольнасці быў адлюстраваны па кожным з іх — як па асноўным, так і па сумяшчальніцтве. Калі атрымаецца так, што па асноўным месцы работы вы знаходзіліся на бальнічным, але па сумяшчальніцтве выконвалі працоўныя функцыі, дапамога па часовай непрацаздольнасці не будзе выплачана, бо ў гэты перыяд вы не страцілі заробак цалкам.

### 18 МЕСЯЦАЎ ЗАМЕСТ ШАСЦІ

Будзе пашыраны разліковы перыяд сярэднядзённага заробку. Цяпер бальнічны вылічваецца толькі па дзеючым месцы работы і ў разліковы перыяд сярэднядзённага заробку ўваходзіць заробак за шэсць каляндарных месяцаў. У новых умовах разліковы перыяд пашырыцца да 18 каляндарных месяцаў, што будуць папярэднічаць кварталу, у якім наступіў выпадак часовай непрацаздольнасці. І ў гэтых 18 месяцах будзе ўлічаны заробак па ўсіх месцах работы грамадзяніна.

— Дадзеныя змяненні абумоўленыя тым, што мы хацелі знізіць нагрузку на бізнес па адміністраванні і вылічэнні дапамог па часовай непрацаздольнасці і перш за ўсё выключыць тое мноства памылак, якія допускаюць бухгалтарскія службы, — кажа кіраўнік фонду.

З будучага года кожны работадавец будзе абазначаць перад фондам выпадак часовай непрацаздольнасці свайго работніка і запытваць інфармацыю па двух параметрах. Першы — памер сярэднядзённага заробку, які будзе вылічаны ў аўтаматызаваным рэжыме на падставе даных персаніфікаванага ўліку (а ён вядзецца па кожным працуючым грамадзяніне з 1 студзеня 2003 года). Другі — працягласць выплаты ўзносаў у бюджэт фонду. Калі ён большы за дзесяць гадоў, работніку кампенсуецца 100 % страчанага заробку, калі меншы — 80 % страчанага заробку.

— Формула спрасцілася, разлік будзе адбывацца з боку Фонду сацыяльнай абароны, а значыць, выключаецца памылка, бо мы стаім на варце абароны правоў грамадзян, — падкрэсліла Юлія Берднікава.

### ВЫЛІЧЫЦЬ ПРАЗ МАБІЛЬНЫ ДАДАТАК

У мабільным дадатку фонду, што даступны з лютага бягучага года, можна атрымаць інфармацыю пра выплаты, на якія былі налічаны ўзносы ў бюджэт фонду. Такім чынам можна паглядзець усе выплаты за 18 месяцаў, адлюстраваныя ў асабовым рахунку, і самастойна разлічыць памер дапамогі. А з 2024 года можна будзе праз дадатак самастойна разлічыць сярэднядзённы заробак. А таксама даведацца і пра другі складнік для разліку бальнічнага — працягласць выплаты ўзносаў у бюджэт фонду на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне.

**Алена КРАВЕЦ.**

Па сутнасці

# Пілюля ад абыякавасці



Калі баліць сэрца — кепска для чалавека, балюча для яго родных і блізкіх. Калі сэрца ўвогуле неадчувальнае — дрэнна для ўсіх. А вось калі нячулае сэрца ў тых, хто займацца лячэннем іншых сэрцаў, то гэта — катастрофа.

У Беларусі медыцына сацыяльна арыентаваная. Вядома, разлічваць у звычайнай райбальніцы на карцінку з замежных тэлесерыялаў пра ўсялякіх хаусаў — глупства. Гэта выдумка. Як і пра ўсёпераможных замежных урачоў. Калі б там насамрэч было так, людзей не заганялі б пад хатні вымушаны «арышт» падчас ковіду. У іх медыцына — піяр, рэклама. Капіталізацыя іміджу. Нічога асабістага — бізнес. У Беларусі, бадай, толькі ў Беларусі, медыцына — асобны дзяржаўны інстытут. Сістэма, якая дастойна вытрымала жорсткае выпрабаванне ковідам. Але і сістэме своечасова патрэбна пілюля.

Бо гэта не цыркуляры і даручэнні. Гэта не толькі новыя будынкі-прыгажуны РНПЦ альбо свежапафарбаваныя і рэканструяваныя раённыя палiклінікі. І нават не апараты яшчэ з пахам заводскай скрыні. Сістэма — гэта людзі. Іх прафесіяналізм і ўважлівыя адносіны. Нельга адкупіцца ад пацыента новымі карпусамі ЦРБ альбо сучаснымі МРТ. Утульныя пакоі перш за ўсё — для камфорту ўрачоў, а тамограф — больш сучасны, але той жа інструмент, як і фанендаскоп. Без чулага сэрца карцінка будзе звычайнай шырмай. За пратаколамі лячэння і пасаднымі інструкцыямі варта не згубіць чалавека. Нават не страціць. У літаральным сэнсе.

А то як атрымліваецца. Усе намаганні, фінансавыя ўкладанні можа сапсаваць адзін «эскулап». Прыйшоў чалавек у кабінет урача па дапамогу, а выйшаў у яшчэ большай роспачы. Па тэлевізары ды ў газетах распавядаюць пра асаблівасць беларускага шляху — чулае стаўленне да чалавека. А насамрэч здараецца і па-іншаму. Урач, як і чыноўнік, — твар дзяржавы. І, па праўдзе кажучы, пратэсны настрой таксама — вынік абыякавасці ці то ў кабінеце тэрапеўта, ці то ў кабінеце старшыні выканкама.

Хіба Прэзідэнт павінен унікаць у сутнасць хранічных хвароб сістэмы аховы здароўя? Яму з галавой хапае геапалітычных пытанняў. А тут тое, што на паверхні. Але ж Лукашэнка па-іншаму не можа.

Дарэчы, сферу медыцыны ў апошнія часы спрабуюць палітызаваць. І падчас ковіду, і праз прасоўванне рэкамендацый новых гендарных «ініцыятыў» і «перспектыў». Прэзідэнт у свой час адназначна даў зразумець: Міністэрства аховы здароўя не павінна займацца палітыкай, медыкі павінны лячыць людзей. А хіба гэта не палітыка? У першую чаргу — унутраная. Толькі ў здаровай нацыі ёсць будучыня. Прафілактыка і лячэнне эфектыўныя нават на міжнародным узроўні. Насамрэч ёсць чым ганарыцца. І самымі невысокімі паказчыкамі дзіцячай смяротнасці. І ўнікальнымі перасадкамі органаў. Тут літаральна — сэрца на далоні. Немаўля ўмяшчаецца на далоні доктара — і такіх дзяцей выратоўваюць!

Але што да такіх вяршынь медыцыны звычайнаму жыхару Палесся альбо Белавежжа? Калі дзверы мясцовага ФАПа больш ніколі не адчыняцца, а ў далёкім райцэнтры малады доктар будзе глядзець не ў вочы пацыенту, а ў далечыню сваіх мрояў. Аб вялікім замежным заробку...

Скнапнасць, абыякавасць, лянота... Хіба гэтыя хваробы душы толькі ў медыцыне? Гэта прыкмета часу. А мы глядзім у медыцыну як у люстэрка. Таму так балюча бачыць саміх сябе. Але ж, што і казаць, хапае добрых ды міласэрных людзей у белых халатах і з чыстай душой. Хапае і недарэк. Гэта дыягназ не толькі ахове здароўя, а і кожнаму з нас.

Чароўнай таблеткі адразу ад усіх хвароб не існуе. А ў дзяржаве, як і ў сям'і: каб не захварэць, не збочыць з правільнага шляху, трэба слухаць Бацьку. І эмацыянальная прафілактыка — толькі дапамога: каб сэрца было больш чулым да чужога болю, тады і хварэць будзем менш.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Людзі справы

# ЯКАСЦЬ СТАЛА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ БРЭНДАМ

**У апошні час нашу краіну вылучаюць як тую, дзе вырабляюць прадукцыю выключна высокай якасці. Менавіта гэта ляжыць у аснове пазнавальнасці, эканамічнай стабільнасці краіны, а таксама высокага жыццёвага ўзроўню кожнага грамадзяніна. Як заўважыў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Пётр ПАРХОМЧЫК падчас цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на суісканне прэміі ўрада за дасягненні ў галіне якасці ў 2022-м, 24-ы год запар дзяржава ўшаноўвае кампаніі, якія дабіліся па-сапраўднаму значных поспехаў у галіне эфектыўнасці вытворчасці і якасці паслуг.**

Асобна адзначаюцца прадпрыемствы, якія ўкаранілі інавацыі і новыя метады кіравання, а таксама прасоўвання сваёй прадукцыі. «За час, які прайшоў з моманту заснавання прэміі, конкурсператварыўся ў нацыянальны праект. Штогод у ім бяруць удзел і становяцца лаўрэатамі арганізацыі прамысловасці, сельскай гаспадаркі і харчавання, транспарту, энергетыкі і будаўніцтва, аховы здароўя і адукацыі. Безумоўна, любыя высокія вынікі і дасягненні — яшчэ адна нагода ганарыцца нашай краінай», — адзначыў Пётр Пархомчык.

Камісія па прысуджэнні прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці прыняла рашэнне прысвоіць званні лаўрэата 25 арганізацыям. «З іх 11 упершыню сталі лаўрэатамі, 14 арганізацый пацвердзілі званне паўторна. Тры арганізацыі ўдастоеныя спецыяльных узнагарод. Сённяшнія пераможцы конкурсу прадстаўляюць розныя сферы эканомікі, але ўсіх іх аб'ядноўвае імкненне працаваць прафесійна і на вынік, жаданне стаць найлепшымі ў сваёй галіне, быць вядомымі не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Ад імя ўрада ён павіншаваў усіх пераможцаў конкурсу, падзякаваў за працу і ўпартасць, энергію і волю, творчы пошук і веру, а таксама за дасягнутыя вынікі. «Заслужыць рэпутацыю лідара, надзейнага партнёра — заўсёды вельмі няпроста. Але яшчэ больш складана яе захаваць. Бо сапраўдны лідар — гэта той, хто фарміруе стандарты ў сваёй сферы, натхняе сваім прыкладам іншых, не спыняецца на дасягнутым і развівае сваю справу», — заявіў намеснік прэм'ер-міністра.

Варта адзначыць, што тры арганізацыі ўдастоены спецыяльных узнагарод конкурсу: «Лідарства», «Дасканаласць менеджменту» і «Сацыяльная адказнасць». Пераможцы прадстаўляюць машынабудаўнічую, транспартную, энергетычную, фармацэўтычную, хімічную, будаўнічую, харчовую галіны, а таксама ўстановы адукацыі і навукі.

Званне лаўрэата прэміі забяспечвае арганізацыі рэпутацыю надзейнага вытворцы высакаякаснай і канкурэнтаздольнай прадукцыі, спрыяе пашырэнню рынкаў яе збыту, адкрывае новыя дзелавыя магчымасці.

Высокае імя конкурсу дае пераможцам цалкам рэальныя плюсы. Лаўрэаты прэміі на працягу трох гадоў могуць выкарыстоўваць выяву яе эмблемы ў маркіроўцы тавараў, дакументацыі, у рэкламных матэрыялах. Звесткі аб прадпрыемствах-пераможцах размяшчаюцца на сайтах Дзяржстандарта, уключаюцца ў штогадовы каталог, які накіроўваецца ў прадстаўніцтвы Беларусі за мяжой.

Учора таксама былі ўручаны нагрудныя знакі «Лідар якасці», узнагароджаны пераможцы конкурсаў «Найлепшы менеджар па якасці» і «Найлепшая дыпломная і навукова-даследчая работа студэнтаў у галіне менеджменту і кантролю якасці».

**Сяргей КУРКАЧ.**

ПаБАЗАРым

# МІЛЬЁН ФАРБАЎ ДЛЯ ВІЦЕБСКА

**Крыху больш за месяц застаецца да галоўнай культурнай падзеі краіны — XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Горад на Дзвіне кожны дзень жыве ў клопатах, рыхтуе новы фестывальны ўбор для жыхароў і гасцей паўночнага рэгіёна. За яго стракатасць і духмянасць адказваюць спецыялісты ДП «Віцебскі зеленбуд», якія сёлета падрыхтавалі ў падарунак гораду звыш мільёна кветак.**

Ужо з надыходам першага цяпла ў пачатку красавіка віцебскія рабочыя зялёнага будаўніцтва выйшлі на вуліцы культурнай сталіцы, каб пачаць ствараць каляровыя квяцістыя дываны. І гэта ў іх атрымліваецца на ўра, бо нездарма Віцебск лічыцца адным з самых квітнеючых гарадоў нашай краіны. З запланаванага мільёна раслін, якія дагэтуль беражліва вырошчвалі ў цяпліцах прадпрыемства, на сённяшні дзень вуліцы ўпрыгожвае больш за 500 тысяч кветак.

«Надвор'е ў бягучым сезоне падрыхтавала для нашых спецыялістаў падарунак. Прычым больш нават не падарунак, а праверку на трываласць: тэмпература днём узнімаецца да 20 градусаў цяпла, ноччу — апускаецца да 5-6. Нам, людзям, цяжка вытрымліваць такія кліматычныя ўмовы, а раслінам — удвая. Таму некаторыя з культур сёлета паводзяць сябе капрызна, але мы знаходзім да іх падыход. Планы, якія былі пастаўлены на сённяшні дзень, выкананы», — адзначае **намеснік дырэктара ДП «Віцебскі зеленбуд» Валянціна ШЭНДЗЮКОВА**.

Распачалі гэты водарны марафон цынерарыі і гарэзлівыя газаніі, цяпер спецыялісты высаджваюць аксаміткі, агератум, сальвію. Петуніі і бягоніі пакуль чакаюць свайго часу — кветкі баяцца начнога холаду, які паўночны рэгіён у чэрвені не пакідае. Але куставыя і ампельныя петуніі абавязкова з'явяцца на праспектах Чарняхоўскага і Маскоўскім у рамках праектаў па вертыкальным азеляненні, якое для спецыялістаў зеленбуда сёлета выходзіць на новы ўзровень. Летась «рэчка» з кашпо ўпрыгожвала плошчу Свабоды. Прадпрыемства атрымала вялікі пазітыўны водгук ад гараджан і гасцей, таму цяпер было вырашана разбавіць жывымі фарбамі раздзяляльныя зоны праспектаў.

Увагі заслугоўвае кожная клумба горада — з вышыні птушынага палёту там можна разгледзець элементы арнаменту, кветкі з раслін, каласы. У гэтым годзе спецыялісты распрацавалі каля 70 новых дызайнаў, на адну клумбу часам прыходзіцца па некалькі праектаў. Але найбольш багатая на кветкавыя пахі і колеры, вядома, тэрыторыя каля Летняга амфітэатра — тут чырванее назва фестывалю і бягуць па адхоне ноты са скрыпічным ключом. Акцэнт у сваіх кампазіцыях майстры «Віцебскага зеленбуда» робяць на Год міру і стваральнай працы, таму і чарговы сюрпрыз для горада будзе адпаведны тэме.

«Сімвал міру — голуб, таму мы распрацавалі кветкавую кампазіцыю, прысвечаную Году міру і стваральнай працы ў выглядзе гэтай белай птушкі. У аснову клумбы, якая будзе размешчана каля галоўнай пляцоўкі фестывалю мастацтваў, закладзены цынерарыі і агератум», — расказвае **дырэктар прадпрыемства Алег СЯНЬКОЎ** і дадае, што работы па афармленні пачнуцца ў канцы чэрвеня.

**Ужо з надыходам першага цяпла віцебскія рабочыя зялёнага будаўніцтва выйшлі на вуліцы культурнай сталіцы, каб пачаць ствараць каляровыя квяцістыя дываны. І гэта ў іх атрымліваецца на ўра, бо нездарма Віцебск лічыцца адным з самых квітнеючых гарадоў нашай краіны. З запланаванага мільёна раслін, якія дагэтуль беражліва вырошчвалі ў цяпліцах прадпрыемства, на сённяшні дзень вуліцы ўпрыгожвае больш за 500 тысяч кветак.**






Майстар ДП «Віцебскі зеленбуд» Таццяна МАСКВІНА.

Цяпер рабочыя зялёнага будаўніцтва працуюць амаль без выхадных, штодзень на вуліцы горада выходзяць каля 40 спецыялістаў і сем адзінак тэхнікі. У ліку тых, хто доўгі час стаіць на варце гарадской прыгажосці, — **майстар Таццяна МАСКВІНА**. Гэтая «сяўба» будзе ў яе біяграфіі сёмай па ліку: аграном па спецыяльнасці і творчая асоба па жыцці, Таццяна Уладзіміраўна паспяхова сумяшчае гаспадарчы клопат кіравання цэлай брыгадай і рэалізацыю палётаў фантазіі на зямлі. Разам з кіраўніцтвам прадпрыемства яна распрацоўвае дызайн-праекты будучых кветкавых дываноў, а натхненне чэрпае ва ўсім, што бачыць навокал: ва ўзоры тратуарнай пліткі, жалезным вензелі на лаўцы... «Летні перыяд не толькі самы цяжкі, але і самы цікавы. Я люблю сваю прафесію, людзей, якія дапамагаюць увасабляць прыгожыя малюнкі ў клумбы. Гэта складана, але большасць маіх калег — апантаныя любоўю да навакольнага свету і да сваёй работы людзі, якія шчыруюць на карысць роднага горада і агульнага добрага настрою. Бывае, вядома, калі наша праца абясцэньваецца некаторымі гараджанамі, але пераважна мы атрымліваем ад людзей эмоцыі захаплення. Гэта наш галоўны стымул рухацца наперад», — дзеліцца Таццяна Масквіна.

Сімвал Міжнароднага фестывалю мастацтваў — валошка. Я пацікавілася, чаму дагэтуль у Віцебску не было блакітнай клумбы з гэтай кветкай. На прадпрыемстве расказалі, што такую ідэю ўжо спрабавалі ажыццявіць, але палявая валошка не прыжываецца ва ўмовах гарадской загазаванасці і забруджанасці глебы. Магчыма, калісьці ў сэрцы горада зазззяе гэтая сціплая, але не менш прыгожая за ўсе астатнія кветка, а пакуль культурная сталіца зіхаціць мільёнам іншых фарбаў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**






## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветны банк прагназуе, што тэмпы росту глабальнай эканомікі рэзка запаволяцца




Сусветны банк прагназуе «змрочныя перспектывы» для глабальнай эканомікі, паведамляе Associated Press. Тэмпы росту, верагодна, рэзка запаволяцца сёлета з-за высокіх працэнтных ставак, наступстваў крызісу ва Украіне і пандэміі каранавіруса. Такі прагноз прадставіў Сусветны банк. Паводле яго ацэнак, міжнародная эканоміка сёлета вырасце ўсяго на 2,1 працэнта пасля росту на 3,1 працэнта летась. Галоўны эканаміст Сусветнага банка Індэрміт Гіл назваў апошнія даныя «яшчэ адной змрочнай справаздачай». Банк, паводле яго слоў, чакае, што рэзкае і сінхранізаванае запаволенне мінулага года працягнецца да рэзкага запаволення сёлета. Як мяркуе Гіл, да канца наступнага года траціна краін, якія развіваюцца, не дасягне ўзроўню даходу на душу насельніцтва, які ў іх быў у канцы 2019-га.

### У Іране прадставілі найноўшую гіпергукавую ракету



Гіпергукавая ракета «Фатах» была паказана Паветрана-касмічнымі сіламі Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі (КВІР) Ірана. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Гіпергукавая ракета была паказана ў прысутнасці афіцыйных асоб — прэзідэнта аяталы Сееда Эбрахіма Раісі і галоўнакамандуючага КВІР Хасейна Саламі. Новая распрацоўка здольная абмінуць сістэмы ПРА і ліквідаваць іх. Далёкасць ракеты «Фатах» складае 1,4 тысячы кіламетраў. Хуткасць, у сваю чаргу, дасягае 14-15 тысяч кіламетраў у гадзіну. Высокая дакладнасць і манеўранасць прадстаўленай ракеты дазваляе ёй заставацца нябачнай для радыёлакацыйных сістэм. Гэты тып ракет ужо выкарыстоўваюць Расія, Кітай і ЗША. Раней Мінабароны Ірана прадставіла мадэрнізаваную ракету вялікай далёкасці, якая атрымала назву «Хайбар».

### У Фінляндыі выпісалі рэкордны штраф за перавышэнне хуткасці




76-гадоваму фінскаму бізнесмену, старшыні холдынгавай кампаніі з прыбыткам 350 мільёнаў еўра ў год Андэрсу Віклёфу быў выпісаны штраф за перавышэнне хуткасці ў 121 тысячу еўра, паведаміла ТАСС. Па словах самога бізнесмена, ён не паспеў знізіць хуткасць з 82 км у гадзіну, калі ў адпаведнасці з дарожным знакам павінен быў скінуць яе адразу на 20 км у гадзіну — з 70 да 50 км у гадзіну. Адзначаецца, што гэта не першае такое парушэнне фіна. Штрафы за парушэнне правілаў дарожнага руху ў Фінляндыі залежаць ад цяжкасці правіннасці і даходу правапарушальніка, які паліцыя імгненна вызначае ў цэнтральнай базе даных падаткаплацельшчыкаў. Самы ж вялікі ў свеце штраф за перавышэнне хуткасці быў выпісаны ў Швейцарыі ў 2010 годзе — каля 1,1 мільёна еўра.

# НА ХВАЛІ СПЁКІ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дык вось, метэаралагічныя карты згаданага інстытута, апублікаваныя айчынным тэлеграм-каналам «Надвор'е», сведчаць аб тым, што ў сярэднім тэмпература летам у нашай краіне будзе на 1,5 градуса вышэй за кліматычную норму. Першы восеньскі месяц таксама парадуе цёплым надвор'ем, ён будзе ў сярэднім на 0,5 градуса цяплейшы, чым звычайна.

Што датычыцца ападкаў, то іх летам 2023 года, паводле ацэнак сіноптыкаў, будзе значна менш, чым звычайна, — у чэрвені-ліпені будзе выпадаць на 5—10 міліметраў ападкаў менш, чым у сярэднім у 1991—2020 гадах. Узровень ападкаў вернецца да нормы толькі да верасня — у пачатку восені ў цэнтральных раёнах, паводле прагнозаў, выпадзе нават на 5—10 міліметраў ападкаў больш, чым звычайна.

А што ж нашы эксперты? Яшчэ раз нагадаем, што афіцыйна айчынныя сіноптыкі не рызыкуюць прадказваць надвор'е больш як на тыдзень, таму што вялікая рызыка памыліцца.

Іншая справа — выказаць здагадку і пазначыць тэндэнцыі на аснове назіранняў апошніх гадоў, як тое робіць вядомы спецыяліст Дзмітрый Рабаў. Паводле яго інфармацыі, аналізуючы прагнастычную інфармацыю сусветных цэнтраў і інстытутаў, можна меркаваць, што лета ў Беларусі чакаецца вельмі цёплым. Тэмпературны фон прагназуецца на 1—2 градусы вышэйшы за кліматычную норму. Не абыдзецца летні перыяд і без спёкі. Яе прынясуць шырокія гарачыя антыцыклоны. «Чакаецца некалькі хваль спёкі працягласцю больш за адзін тыдзень», — папярэдзіў Дзмітрый Рабаў.

Спецыяліст лічыць, што перыяды пахаладанняў не будуць працяглымі. Сайты доўгатэрміновых прагнозаў надвор'я абяцаюць у найбліжэйшыя тры тыдні чэрвеня дзённую тэмпературу ад 18 да 25 цяпла. А ў апошняй дэкадзе — каля 25 цяпла.

Паводле айчыннай статыстыкі, сярэдняя тэмпература летняга сезона — плюс 18 градусаў. Яна ўзрастае па тэрыторыі краіны з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход і змяняецца ў межах ад плюс 16,7 градуса да плюс 19,4 градуса.

Самае халоднае лета было амаль сто гадоў таму — у 1928 годзе, тады сярэдняя тэмпература была плюс 14,6 градуса. А самае цёплае лета адзначалася ў 2010-м, з сярэдняй тэмпературай плюс 20,6 градуса.

У чэрвені—жніўні ў сярэднім адзначаецца ад 29 да 57 гарачых дзён (дзён з максімальнай тэмпературай паветра плюс 25 градусаў і вышэй). У асобныя гады дзённыя максімумы ўзнімаюцца да плюс 35 градусаў і вышэй, што з'яўляецца небяспечнай гідраметэаралагічнай з'явай, распавялі ў Белгідрамеце.

Рэкорд чэрвеньскай спякоты быў устаноўлены 23 чэрвеня 2021 года і склаў плюс 37,1 градуса. Рэкорд холаду — мінус 2,3 градуса — быў адзначаны ноччу 1 чэрвеня 2001 года на станцыі «Палеская» і 11 чэрвеня 1982 года ў Оршы.

Ліпень у Беларусі — самы цёплы і дажджлівы месяц лета. Самы гарачы ліпень быў у 2010 годзе (плюс 22,6 градуса), а самы халодны — у далёкім 1979-м (плюс 14,4 градуса).

А абсалютны рэкорд дня спёкі ў Беларусі за ўвесь час назіранняў быў у жніўні. У Гомелі 8 жніўня 2010 года зафіксавалі плюс 38,9 градуса. Самы халодны быў жнівень 1966-га — мінус 3,4 градуса 30 жніўня 1966 года на станцыі «Палеская».

## БУДУЧЫЯ РЭКОРДЫ ПЯЦІГОДКІ

А цяпер мы прааналізуем новы бюлетэнь Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі. Пра што кажуць нам гэтыя лічбы? Верагоднасць таго, што прынамсі ў адзін з гадоў у перыяд з 2023 да 2027 года сярэднегадавая глабальная прыземная тэмпература больш чым на 1,5 градуса перавысіць даіндустрыяльныя ўзроўні 1850—1900 гадоў, складае 66 %. Верагоднасць таго, што хоць бы адзін з наступных пяці гадоў і пяцігадовы перыяд у цэлым стануць самымі цёплымі ў гісторыі назіранняў, складае 98 %.

«Гэты даклад не азначае, што мы назаўжды перавысім узровень у 1,5 градуса, названы ў Парыжскім пагадненні, якое датычыцца доўгатэрміновага пацяплення на працягу многіх гадоў. Тым не менш, СМА выказвае трывогу з нагоды таго, што частата часовых перавышэнняў узроўню ў 1,5 градуса будзе нарастаць», — заявіў генеральны сакратар метэаралагічнай арганізацыі прафесар Петэры Таалас.

«У найбліжэйшыя месяцы чакаецца гарачая з'ява Эль-Ніньё, якая ў спалучэнні з антрапагенным змяненнем клімату выведзе глабальныя тэмпературы на невядомую тэрыторыю. Гэта будзе мець далёка ідучыя наступствы для здароўя, харчовай бяспекі, кіравання воднымі рэсурсамі і навакольнага асяроддзя. Нам трэба падрыхтавацца», — сказаў Таалас.

Згодна з бюлетэнем на глабальным клімаце на перыяд ад года да дзесяцігоддзя, вядучым цэнтрам СМА па такіх прагнозах, верагоднасць таго, што сярэдні пяцігадовы пакажчык перавысіць парог у 1,5 градуса, складае ўсяго 32 %.

Верагоднасць часовага перавышэння адзнакі ў 1,5 градуса пастаянна расце з 2015 года, калі яна была блізкая да нуля. У перыяд з 2017 да 2021 года верагоднасць перавышэння складала ўжо 10 %.

У гэтым дакладзе паведамляецца, што сярэдняя глабальная тэмпература паветра ў 2022 годзе была на 1,15 градуса вышэйшая, чым у сярэднім за 1850—1900 гады. Ахаладжальны эфект феномена Ла-Нінья, які крыху запаволіў доўгатэрміновую тэндэнцыю да пацяплення на працягу апошніх трох гадоў, зменшыўся летась, і дадзеная з'ява скончылася ў сакавіку 2023 года.

У найбліжэйшыя месяцы прагназуецца развіццё з'явы Эль-Ніньё, якая павышае сярэднюю глабальную тэмпературу на наступны год пасля яе пачатку, гэта значыць у 2024 годзе. Чакаецца, што да 2027 года сярэдняя глабальная тэмпература паветра ў асобныя гады будзе на 1,1—1,8 градуса вышэйшая за сярэднюю даіндустрыяльную.

Імавернасць таго, што, прынамсі, у адзін з наступных пяці гадоў будзе пабіты тэмпературны рэкорд, устаноўлены ў 2016 годзе, калі адбылася выключна моцная з'ява Эль-Ніньё, складае 98 %, паведамляюць эксперты метэаралагічнай арганізацыі.

## АДХІЛЕННЕ АД НОРМЫ

Сіноптыкі нашай суседкі прагназуюць, што будучае лета ў Расіі можа стаць самым гарачым за апошнія 150 гадоў. Кліматолагі гэтай краіны заяўляюць, што змены клімату выкліканыя ў першую чаргу дзейнасцю чалавека, і ён жа ў стане знізіць іх тэмп.

«Тэмпературная анамалія — рэч адносная. На поўначы Расіі 28 градусаў — ужо анамалія, а ў Краснадары такой будзе, напэўна, тэмпература плюс 40 градусаў. Прычым чым далей на поўнач, тым адхіленне ад тэмпературнай нормы істотнейшае. Растлумачыць гэта можна асаблівасцю цыркуляцыі атмасферы ў эпоху глабальнага пацяплення. Уварванне паветраных мас часцей адбываецца ў мерыдыянальным кірунку. Гэта значыць халоднае паветра ідзе з поўначы або гарачае паветра ідзе з поўдня», — адзначае эксперт.

Хвалі спёкі ж, па словах кліматолага, фіксуюцца, калі анамальна высокая тэмпература трымаецца пяць і больш дзён. Такія сітуацыі небяспечныя для здароўя чалавека, яны павялічваюць рызыку сардэчна-сасудзістых ускладненняў і смяротных зыходаў. Таму трэба старацца пазбягаць працяглага ўздзеяння спякоты, выкарыстоўваць кандыцыянеры і па магчымасці з'язджаць з мегаполісаў у больш прахалодныя месцы.

«Мы павінны быць гатовыя да таго, што частата небяспечных з'яў, у тым ліку хваль спёкі, вырасце разы ў тры. Але будзем спадзявацца, што не ў дзесяць. Таму што сусветная супольнасць — усе краіны: і Расія, і Кітай, і ЗША — заявіла пра намер дасягнуць вугляроднай нейтральнасці да канца стагоддзя, у 2060—2070-я гады. Гэта значыць зменшыць выкіды, а тыя, што засталіся, кампенсаваць за кошт паглынання лясамі», — заявіў кліматолаг.

Спецыялісты мяркуюць, што частата небяспечных метэаралагічных з'яў узрасце ўдвая да сярэдзіны стагоддзя. Хвалі спёкі будуць большыя і мацнейшыя, ападкі пачнуць выпадаць больш нераўнамерна: калі пэўная колькасць ападкаў выпадала за дзве гадзіны, то цяпер — за 20 хвілін, а снегападаў стане мала, але яны будуць вельмі моцнымі.

«Лячэнне праблем клімату — беражлівае стаўленне да рэсурсаў: да вады, да электраэнергіі, да прадуктаў харчавання, — адзначае эксперт. — Гэта вельмі правільны шлях, ён вядзе да зніжэння выкідаў парніковых газаў. Тут палягае галоўны фактар, якім чалавек уплывае на клімат».

## ПРАБЛЕМА ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Анамальная спякота вельмі цяжка пераносіцца ў мегаполісах. Як лічаць расійскія эксперты, самае небяспечнае — яе наступствы. Вядома, што гарачыня ўплывае на здароўе людзей. Прычым не маладых і здаровых, а, як правіла, пажылых або тых, якія маюць сардэчна-сасудзістыя захворванні. Наогул само паняцце «хваля спякоты» — шмат у чым медыцынскае. Галоўная геафізічная абсерваторыя ў Пецярбургу лічыць хвалі спёкі, калі максімальная тэмпература днём перавышае нейкае значэнне на працягу пяці і больш дзён. Таму што да гэтага наш арганізм трымаецца, а пасля пачынае ламацца. На жаль, колькасць смяротных зыходаў большае нават не падчас хвалі спякоты, а калі яна ўжо скончылася.

Мегаполіс — гэта, вядома, чорны распалены асфальт. Калі ў прыгарадах ці дзесьці ў дачнай мясцовасці тэмпература 30 градусаў, то ў цэнтры мегаполіса будзе мінімум 35 градусаў. Зразумела, што там людзям значна цяжэй.

Пацяпленне ўплывае і на інфекцыйныя захворванні — іх пераносчыкі выдатна сябе адчуваюць пры больш цёплых тэмпературах. У прыродзе могуць быць і паводкі, і засухі, і лясныя пажары, і праблемы для інфраструктуры на вечнай мерзлаце. Якая, на жаль, растае, кожнае лета ўсё глыбей.

## ЛЕДНІКОВЫ ПЕРЫЯД БУДЗЕ, АЛЕ НЯХУТКА

Натуральныя змены клімату заўсёды былі, ёсць і будуць. Але яны вельмі доўгатэрміновыя. Мы рухаемся ад аднаго ледніковага перыяду да наступнага. Цяпер мы ў цёплым прамежку, ён звычайна доўжыцца каля 20 тысяч гадоў, а прыкладна 80 тысяч гадоў — халодны перыяд. Вядома, праз нейкую колькасць тысячагоддзяў мы паступова будзем уваходзіць у халодны перыяд, але гэта гіганцкі маштаб.

Цяпер паглядзім, што адбываецца кожны год і як залежыць клімат ад варыяцый акіянскіх плыняў. Ёсць такія з'явы ў Ціхім акіяне, як Эль-Ніньё і Ла-Нінья. Супрацьлеглыя фазы, якія залежаць ад цыклаў сонца. Усё гэта вельмі моцна ўплывае на тэмпературу ў канкрэтны год. У прамежкавым маштабе 50—100 гадоў галоўным фактарам будзе ўзмацненне чалавекам парніковага эфекту. Ёсць і іншыя эфекты ад чалавека, якія накладаюцца на натуральныя варыяцыі і з'яўляюцца дамінуючымі. Будзем спадзявацца, што чалавецтва з усім гэтым справіцца, а нашы далёкія нашчадкі проста забудуць пра тое, што былі такія казусы ў гісторыі Зямлі. Будзем спадзявацца, што мы выйдзем з сітуацыі з мінімумам страт.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# МЕДЫЙНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ПРА ЯНКУ МАЎРА

**Выйшаў пяты, майскі, нумар навуковага і метадычнага часопіса «Роднае слова», прысвечаны класіку беларускай дзіцячай літаратуры Янку МАЎРУ (1883 — 1971). Усе 94 старонкі аўтарытэтнага ў айчыннай агульнаадукацыйнай і вышэйшай школе выдання прысвечаны жыццю і творчасці пісьменніка, на творах якога выхоўвалася не адно пакаленне дзяцей.**

Ва ўступным слове да нумара галоўны рэдактар часопіса Наталля ШАПРАН адзначае: «... гэты нумар не толькі ўмацоўвае традыцыю часопісных альманахаў, але і вылучаецца ў іх шэрагу ўзнёслым настроем, прадчуваннем хуткай разгадкі, што вось-вось напаткае навукоўцу-вандроўніка. Чамусьці здаецца, што працуючы над грунтоўнымі артыкуламі, шаноўныя аўтары часам не маглі стрымаць усмешкі на вуснах. Нібы той хлопчык з апавядання пісьменніка «Шчасце», якога перапаўняла невымернае пачуццё...» І далей: «Свет Янкі Маўра найперш належыць дзецям. Вось чаму ў нашым альманаху ідзе гаворка пра гісторыю станаўлення ў Беларусі дзіцячага радыётэатра і кінематографа, разглядаецца навучанне асэнсаванаму чытанню — важнаму складніку выхавання асобы і яе сацыялізацыі, прапануюцца сучасныя формы работы з дзецьмі — інтэлектуальныя гульні, літаратурныя квэсты і інш.

А яшчэ тут іскрыцца яркімі фарбамі сведчанне жывога чытацкага водгуку на творы «Дзеда Маўра» — нібыта сённяшнюю дзятву і мудрае слова пісьменніка не падзяляюць дзесяцігоддзі ды неверагодныя здабыткі навукова-тэхнічнага прагрэсу. Відаць, дзіцячая прага да новага і аўтарская шчырасць мацнейшыя за іх...»

У «маўраўскім» нумары выступаюць доктар філалагічных навук Ванда БАРОЎКА («Фенаменальнасць прыгодніцкіх аповесцяў Янкі Маўра 1920-х гг.»), кандыдат філалагічных навук Віктар ЖЫБУЛЬ («Кожны новы дом — гэта мастацкі твор...» з падзагалоўкам: «Сталіца ў жыцці і творчасці Янкі Маўра»), кандыдат філалагічных навук Марыя ШАМЯКІНА («Піянер дзіцячай фантастыкі Янка Маўр»), кандыдат філалагічных навук Ала ЖАРДЗЕЦКАЯ («Свет дзяцінства — асобная планета»; у падзагалоўку: «Наватарства Янкі Маўра ў станаўленні беларускай дзіцячай літаратуры»), кандыдат філалагічных навук Алена МІХАЛЕВІЧ («Моўны талент Янкі Маўра»), доктар філалагічных навук Вольга ЛЯШЧЫНСКАЯ «Заканамернасці фразеалогіі і выкарыстання фразеалагізмаў у мове аповесці «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра»), іншыя дасведчаныя вучоныя, настаўнікі.

Адметную і раней не распрацаваную тэму раскрывае і літаратуразнаўца Сяргей ШАПРАН у артыкуле «Пісьменнік Янка Маўр як персанаж мастакоўскіх жартаў».

«Маўраўскі» нумар «Роднага слова» багата ілюстраваны. Увогуле перыядычнае выданне па праве можна лічыць энцыклапедычным у адлюстраванні жыцця і творчасці класіка.

140-гадовы юбілей Янкі Маўра знайшоў сваё выразнае адлюстраванне на старонках многіх і многіх перыядычных выданняў краіны, у вядучых грамадска-палітычных газетах («Звязда», «СБ. Беларусь сегодня» і іншых), на тэлебачанні і радыё. Раней складвалася традыцыя, што юбілеі такіх яркіх асоб, якія прынеслі гонар нашай літаратуры, нашай культуры, нашай краіне, асвятляліся і ў мясцовых




рэгіянальных выданнях. Хацелася б вярнуць гэту традыцыю. А калі ўсё ж нехта будзе яе аднаўляць у розных раённых і абласных газетах, то ўжо сёння знайдзіце пяты, майскі, нумар «Роднага слова» за сёлетні год. Вас чакае мноства адкрыццяў, вы пазнаёміцеся з выдатнай кагортай маўразнаўцаў.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

8 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15955)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года




Маладыя імёны

## Ангеліна ЯРАШЧУК:

# «Заўсёды бяруся за нялёгкія задачы»

**Нашай гераіні 16 гадоў, а яе дзень распісаны па хвілінах. У яе досыць работы ў шматлікіх праектах, перамог у конкурсах і цікавага досведу. Мы пагаварылі з дзяўчынай і даведаліся, як ёй удаецца пераадольваць страхі і ўвасабляць у жыццё самыя смелыя мары.**

Па словах гераіні, з дзяцінства яна была суперактыўнай. Мама старалася пазнаёміць яе з рознымі захапленнямі, якія толькі існуюць. Ангеліна займалася і спевамі, і гімнастыкай. Пачынаючы з пяці гадоў дзяўчынка наведвала шмат гурткоў, а вось уласна спевы ўзніклі выпадкова.

— У мяне не было асаблівых вакальных даных: калі прыйшла праслухоўвацца, сказалі, што я наўрад ці даб'юся значных поспехаў, — згадвае дзяўчына. — Але, як той казаў, я вельмі ўпартая і працалюбівая. Толькі ўпартасць і праца з педагогамі, а галоўнае — жаданне, і дапамагаюць дамагацца таго, чаго сапраўды хочацца.

У Ангеліны большасць аўтарскіх песень, але ёсць і творы з рэпертуару іншых спявачак.

— Я супрацоўнічаю з таленавітым кампазітарам Аляксандрам Сухаравым, таму ў мяне шыкоўныя, прыгожыя, лірычныя і рытмічныя мелодыі «Мова», «Загадай жаданне», «Пульс», ёсць таксама і іншыя аўтарскія песні — «Feeling good», «Толькі трымайся», «Балет», «Я беларуска». Лічу сябе ўніверсальный вакалісткай, таму песню падбіраю пад пэўнае мерапрыемства. Заўсёды бяруся за нялёгкія задачы, якія, здавалася б, немагчыма выканаць, і скажу, што заўсёды атрымліваецца.

Ангеліна шмат за што ўдзячная маці. Найперш, за тую падтрымку і дапамогу, якую яна пастаянна аказвае. Наталля Яўгенаўна не прапускае ні адно выступленне дачкі, заўсёды побач за кулісамі.

— Мама — незаменная частка майго жыцця, — кажа наша гераіня. — Яна дапамагае з пераапрананнем, хвалюецца, вырашае праблемы, адвозіць і забірае мяне пасля канцэртаў, заняткаў. Без яе было б усё складана.

— У вас прыгожыя вобразы падчас выступленняў. Раіцеся з матуляю наконт гэтага?

— Сцэнічная сукенкі, як правіла, — ідэя мамы. Яна вельмі часта бывае на рэпетыцыях, уяўляе вобраз, натхняецца песняй і сама пачынае распрацоўваць касцюмы. Пасля знаходзіць людзей, якія могуць стварыць такую прыгажосць.

Маці нашай гераіні не звязана са светам музыкі — яна настаўніца англійскай мовы. Аднак, па словах Ангеліны, заўсёды была актыўнай і за столькі гадоў знаходжання ў творчым асяроддзі вельмі добра разбіраецца ў музыцы. Наталля Яўгенаўна не толькі дарадца дачкі, але і строгі настаўнік, які працуе з ёй у адной камандзе. Тата, Яўген Варфаламеевіч, таксама заўсёды на сувязі, падтрымлівае маральна, глядзіць канцэрты з удзелам дачкі па тэлебачанні.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

# УХВАЛЕНЫ САМЫЯ ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ПРАЕКТЫ

**У сталіцы ў Рэспубліканскім доме моладзі адбылося пасяджэнне рэспубліканскай камісіі па падвядзенні вынікаў другога сезона конкурсу маладзёжных ініцыятыў.**



У яе склад пад старшынствам міністра адукацыі Андрэя Іванца ўвайшлі прадстаўнікі органаў выканаўчай улады, дэпутацкага корпуса, вядучых грамадскіх аб'яднанняў краіны, ФПБ, Савета маладых вучоных НАН Беларусі, Савета працоўнай моладзі. Гаворачы аб конкурсе, міністр адукацыі Андрэй Іванец падкрэсліў, што сёння такі фармат узаемадзеяння ў маладых людзей запатрабаваны. Усяго на адрас арганізацыйнага камітэта паступіла 219 заявак.

Сярод асноўных крытэрыяў ацэнкі былі актуальнасць і сацыяльная значнасць ініцыятывы. Праекты закранаюць розныя напрамкі: захаванне гістарычнай памяці, фарміраванне музейных экспазіцый, IT-сфера, адкрыццё каворкінг-цэнтраў і інавацыйных модульных пляцовак. Акрамя таго, паступілі заяўкі ў сферы міжнароднага супрацоўніцтва, добраўпарадкавання. Шмат разнастайных прапаноў, звязаных з засваеннем інфармацыйнай прасторы, у тым ліку мабільныя дадаткі, сайты, цікавыя платформы.

З ліку ўсіх прадстаўленых праектаў на рэспубліканскім узроўні пад увагу камісіі трапіла 48 праектаў, з якіх былі вызначаны 20 найлепшых, што атрымаюць фінансавую падтрымку з дзяржбюджэту, а таксама ўстановы, якія забяспечваюць рэалізацыю заяўленых праектаў. Яшчэ два праекты будзе фінансаваць БРСМ. Дарэчы, калі нейкая ініцыятыва не стала пераможцам, то яе можна дапрацаваць і падаць на конкурс на 2024 год. Заяўкі ў трэцім сезоне плануецца прымаць ужо ў верасні—кастрычніку.

Асноўны напрамак рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў — стварэнне ўмоў для падтрымкі актыўнага ўдзелу маладых грамадзян у сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсах, фарміраванні і рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Прафарыенцір

# ДЫЗАЙН МУЛЬТЫМЕДЫЯ І МІКРАБІЯЛОГІЯ

## Якія спецыяльнасці прапануюць абітурыентам установы адукацыі ў рэгіёнах

**Прынцып «дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся» ў Міністэрстве адукацыі раяць узяць абітурыентам на ўзбраенне і паступаць у рэгіянальныя ВНУ. У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы сёлета на два працэнты быў скарочаны прыём у сталічныя ўстановы вышэйшай адукацыі і прыкладна на столькі ж павялічаны прыём у рэгіянальныя ВНУ. Гэта абумоўлена неабходнасцю замацавання кадраў у абласцях.**

**Напрыклад, вышэйшыя навучальныя ўстановы Віцебскай вобласці плануюць прыняць у гэтым годзе каля 4,5 тысячы абітурыентаў, з якіх каля 2,7 тысячы — на бюджэт. У ВНУ Брэсцкай вобласці план прыёму складае каля 4 тысяч чалавек: больш за 2 тысячы плануецца прыняць за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і каля 1,9 тысячы абітурыентаў — на платнай аснове.**

**Для таго каб прыцягнуць на вучобу добра падрыхтаваных і матываваных абітурыентаў, патрабуецца карпатлівая мэтанакіраваная прафарыентацыйная работа. Гэта добра разумеюць у рэгіянальных установах адукацыі, бо ім даводзіцца канкурыраваць за сваіх абітурыентаў са сталічнымі ВНУ.**

### Мэтавы набор — на новых умовах

Як адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей ПІШЧОЎ**, прыёмная кампанія гэтага года праходзіць з улікам шэрагу навацый, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца прыцягненне найбольш матываваных абітурыентаў, якія ведаюць тыя кірункі, з якімі ў далейшым плануюць звязаць сваю прафесійную дзейнасць.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



# ДЫЗАЙН МУЛЬТЫМЕДЫЯ І МІКРАБІЯЛОГІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Па меркаванні прадстаўніка Міністэрства адукацыі, рэгіянальныя ВНУ правялі сур'ёзную работу па фарміраванні лічбаў прыёму ва ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Упершыню набор на мэтавыя месцы быў вынесены за рамкі асноўнай прыёмнай кампаніі. Ён стартаваў 1 чэрвеня. З 6 да 13 чэрвеня ў ВНУ праходзяць уступныя іспыты ў вуснай або практычнай форме. А залічэнне адбудзецца да 16 чэрвеня. Абітурыенты, якім не пашчасціць паступіць на мэтавае месца, змогуць прыняць удзел у прыёмнай кампаніі ў асноўную хвалю, якая распачнецца 17 ліпеня.

Па словах Сяргея Пішчова, ва ўстановах вышэйшай адукацыі Брэсцкай вобласці выдзелена каля 500 мэтавых месцаў (без уліку педагагічных спецыяльнасцяў). Гэта сведчыць аб тым, што прадпрыемствы рэгіёна нацэлены на тое, каб рыхтаваць спецыялістаў канкрэтна пад свае вытворчасці.

У параўнанні з 2022 годам у рэгіёне быў павялічаны набор на запатрабаваныя спецыяльнасці «Матэматыка і інфарматыка», «Фізіка і інфарматыка», «Дашкольная адукацыя», «Сучасныя замежныя мовы», «Мытная справа».

## Каб моладзь не з'язджала ў сталіцу

Навацыя гэтай уступнай кампаніі — прывілеі, якія атрымалі выпускнікі трох устаноў адукацыі. Так, выпускнікі Ліцэя Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, Ліцэя Беларуска-Расійскага ўніверсітэта і Ліцэя БДУ змогуць стаць студэнтамі гэтых ВНУ без здачы экзаменаў. Такая прывілея распаўсюджваецца на тых, хто мае ў дакуменце аб адукацыі адзнакі не ніжэй за «9» балаў па вучэбных прадметах, што адпавядаюць прадметам профільных іспытаў, і адзнакі не ніжэй за «8» балаў па ўсіх астатніх вучэбных прадметах.

Адметнасцю прыёмнай кампаніі сталі і алімпіяды, якія праходзілі ў рэгіянальных ВНУ ў лютым-сакавіку гэтага года. Па іх выніках шэраг абітурыентаў ужо рэкамендаваны да залічэння. Так, напрыклад, у Полацкім дзяржаўным універсітэце алімпіяды праходзілі па васьмі прадметах. Іх пераможцы мелі магчымасць без экзаменаў паступіць на 15 спецыяльнасцяў.



Фота Лізаветы ГОЛАД

